УА “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”
Факультэт дадатковай адукацыі

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Першы прарэктар БДУКМ
________________ Ю.П.Бондар
“____” ________________2012 г.

ВУЧЭБНАЯ ПРАГРАМА ПА ДЫСЦЫПЛІНЕ

# Навукова-метадычная дзейнасць бібліятэк

спецыяльнасці перападрыхтоўкі
1-23 02 71 Бібліятэказнаўства і бібліяграфія
кваліфікацыя: *бібліятэкар-бібліёграф*
у адпаведнасці з тыпавым вучэбным планам перападрыхтоўкі,
зацверджаным 03.11.2010 г., рэг.№ 25-17/189

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск 2012

Распрацоўшчык праграмы:
Л.А.Дзямешка, прафесар кафедры менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”, кандыдат педагагічных навук, дацэнт.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Рэкамендавана да зацвярджэння:

Саветам факультэта дадатковай адукацыі УА “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”
Пратакол паседжання ад ____________ № ______

Навукова – метадычным саветам УА “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”
Пратакол паседжання ад ____________ № ______

# УВОДЗІНЫ

## *1.1. Актуальнасць вывучэння вучэбнай дысцыпліны "Навукова-метадычная дзейнасць бібліятэк"*

Вучэбная дысцыпліна "Навукова-метадычная дзейнасць бібліятэк" з'яўляецца дысцыплінай спецыялізацыі ў комплексе дысцыплін неабходных для падрыхтоўкі бібліятэкараў-бібліёграфаў вышэйшай кваліфікацыі ў адпаведнасці з вучэбным планам факультэта дадатковай адукацыі. Актуальнасць вывучэння гэтай дысцыпліны абумоўлена прафесіяналізацыяй кіраўнічай дзейнасці бібліятэк. Навукова абгрунтаваная метадычная работа адыгрывае значную ролю ў арганізацыі выканання бібліятэкамі іх сацыяльных функцый, яна з'яўляецца аб'ектыўнай умовай удасканалення дзейнасці бібліятэк, іх развіцця.

Упраўленне дзейнасцю бібліятэк у сучасных умовах у многім звязана з метадычным забеспячэннем іх работы, што прыйшло на змену метадычнаму кіраўніцтву, характэрнаму для ўпраўлення бібліятэчнай справай у гады савецкай улады. У сучасных умовах спецыяліст з профільнай вышэйшай адукацыяй павінен валодаць методыкай арганізацыі бібліятэчнай справы і навыкамі яе распрацоўкі і ўдасканалення. Работа бібліятэк-метадычных цэнтраў накіравана на дапамогу сетцы бібліятэк і здзяйснення метадычнага забеспячэння функцыяніравання бібліятэк і бібліятэчных сістэм па ўсіх напрамках, працэсах бібліятэчнай работы шляхам адпаведных метадычных распрацовак і рэкамендацый. Узрастанне ролі арганізуючага кампанента для функцыяніравання бібліятэк, бібліятэчных сістэм абумоўлівае неабходнасць падрыхтоўкі спецыялістаў, якія, з аднаго боку, валодаюць грунтоўнымі тэарэтычнымі ведамі па пытаннях навукова-метадычнай работы, а з другога боку, маюць канкрэтныя прафесійныя ўменні ў арганізацыі і ажыццяўленні разнастайных напрамкаў практычнай метадычнай дзейнасці.

Дысцыпліна "Навукова-метадычная дзейнасць бібліятэк" цесна ўзаемазвязана з дысцыплінамі спецыяльнасці "Бібліятэчна-інфармацыйны менеджмент", "Бібліятэчна-інфармацыйны маркетынг" і інш.

## *1.2. Мэты і задачы вывучэння вучэбнай дысцыпліны "Навукова-метадычная дзейнасць бібліятэк"*

**Агульнай мэтай** вывучэння дысцыпліны "Навукова-метадычная дзейнасць бібліятэк" з'яўляецца – фарміраванне прафесійных кампетенцыі ў слухачоў ў межах агульных мэтаў падрыхтоўкі спецыялістаў, фарміраванне і развіццё іх прафесійнай кампетэнтнасці для рашэння задач у сферы прафесійнай дзейнасці; развіццё і замацаванне акадэмічных і сацыяльна-асобасных кампетэнцый.

**Прыватнай мэтай** вывучэння дысцыпліны "Навукова-метадычная дзейнасць бібліятэк" з'яўляецца ***фарміраванне*** ў слухачоў устойлівых ведаў, якія датычацца сутнасці навукова-метадычнай работы як працэса кіравання, які аказвае непасрэднае ўздзеянне на арганізацыю работы бібліятэкі як цэласнай сістэмы; *садзейнічанне* фарміраванню прафесійных кіраўнічых кампетэнцый будучых бібліятэкараў-бібліёграфаў вышэйшай кваліфікацыі; ***развіццё*** і ***замацаванне*** акадэмічных і сацыяльна-асобасных кампетэнцый.

Мэтавая накіраванасць дысцыпліны абумоўлівае кола задач, рэалізацыя якіх забяспечыць фарміраванне неабходных для спецыялістаў ведаў і уменняў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Задачы вывучэння дысцыпліны:**

– фарміраванне ў слухачоў на аснове міждысцыплінарнага падыходу сістэмных ведаў аб сутнасці навукова-метадычнай работы, яе асноўных напрамках, аб ролі аналітычнай дзейнасці і дзейнасці па распаўсюджванню інавацыйнага вопыту ў метадычным забеспячэнні дзейнасці бібліятэк, аб кансультатыўнай рабоце метадычных цэнтраў як форме метадычнай дапамогі бібліятэкам, аб асноўных формах павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі бібліятэчных кадраў і інш.

– фарміраванне ўменняў прымяняць веды, якія датычацца навукова-метадычнай работы бібліятэк: *авалоданне методыкай* падрыхтоўкі метадычных выданняў, арганізацыйна-распарадчай дакументацыі, *методыкамі* правядзення метадычнага маніторынга ў бібліятэках, складання планаў абследавання ў бібліятэк, аказання метадычнай дапамогі бібліятэкам, арганізацыі мерапрыемстваў па павышэнню кваліфікацыі і перападрытоўкі супрацоўнікаў бібліятэк; *фарміраванне ўменняў* планавання дзейнасці бібліятэк, правядзення кансультацый для супрацоўнікаў бібліятэк па найбольш актуальных пытаннях бібліятэчнай практыкі, ажыццяўлення аналізу і прагназіравання дзейнасці бібліятэк;

– фарміраванне ўмення выкарыстоўваць рэгламентуючую дакументацыю ў практычнай дзейнасці бібліятэк;

– развіццё здольнасці да пастаяннай самаадукацыі і эфектыўнай самарэалізацыі ў прафесіі.

### *1.3. Патрабаванні да ўзроўню засваення зместу вучэбнай дысцыпліны*

Слухач павінен валодаць наступнымі ***акадэмічнымі кампетэнцыямі***:

– валодаць базавымі навукова-тэарэтычнымі ведамі і прымяняць іх для вырашэння тэарэтычных і практычных задач;
– валодаць сістэмным і параўнальным аналізам;
– валодаць даследчымі навыкамі;
– умець працаваць самастойна;
– быць здольным фарміраваць новыя ідэі;
– валодаць міждысцыплінарным падыходам пры вырашэнні праблем;
– умець выкарыстоўваць тэхнічныя ўстройствы і камп'ютарныя тэхналогіі;
– умець вучыцца, павышаць сваю кваліфікацыю на працягу ўсяго жыцця.

Слухач павінен мець наступныя ***сацыяльна-асабовыя кампетэнцыі*:**
– валодаць якасцямі грамадзянскасці;
– быць здольным да сацыяльнага ўзаемадзеяння;
– валодаць здольнасцю да міжасабовых камунікацый;
– быць здольным да крытыкі і самакрытыкі;
– умець працаваць у калектыве;
– валодаць прафесійнай этыкай;
– клапаціцца аб высокім грамадскім статусе сваёй прафесіі.

У выніку вывучэння дысцыпліны слухач павінен ***быць здольным да навукова-метадычнай дзейнасці*** і валодаць ***прафесійнымі кампетэнцыямі***, якія прадугледжаны адукацыйным стандартам ОС РБ 1-23 01 11 2008:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– назапашваць і вывучаць сусветны вопыт інавацыйнай дзейнасці бібліятэк і інфармацыйных цэнтраў, распаўсюджваць і ўкараняць яго ў практыку работы бібліятэк сваёй сістэмы;

– праводзіць метадычны маніторынг у бібліятэках;

– збіраць і аналізаваць справаздачную дакументацыю;

– аказваць метадычную дапамогу бібліятэкам сваёй сістэмы па разнастайных накірунках бібліятэчна-інфармацыйнай і культурна-дасугавай дзейнасці праз кансультацыйную дапамогу, падрыхтоўку метадычных матэрыялаў і парад;

– выкарыстоўваць і пры неабходнасці распрацоўваць сумесна з іншымі падраздзяленнямі бібліятэкі арганізацыйна-распараджальныя, нарматыўныя і тэхналагічныя дакументы дзейнасці бібліятэк;

– арганізоўваць павышэнне кваліфікацыі і перападрытоўку супрацоўнікаў бібліятэк;

– кіраваць навукова-метадычным падраздзяленнем бібліятэкі.

Для набыцця прафесійных кампетэнцый у выніку вывучэння дысцыпліны слухач павінен

**ведаць:**

– гісторыю развіцця метадычных служб;

– асноўныя паняцці, прынцыпы і функцыі метадычнага забеспячэння дзейнасці бібліятэк;

– арганізацыйныя формы і структуру метадычнай службы бібліятэкі;

– асноўныя напрамкі менеджменту навукова-метадычнай дзейнасці бібліятэк;

– праблемы і перспектывы павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі бібліятэчных кадраў.

**умець:**

– праводзіць маніторынг дзейнасці бібліятэкі;

– весці работу па ўдасканаленні бібліятэчных цыклаў і працэсаў;

– ажыццяўляць улік, справаздачнасць і планаванне работы;

– аказваць метадычную дапамогу бібліятэкам;

– распрацоўваць метадычныя дапаможнікі, арганізацыйна-распарадчую дакументацыю;

– складаць планы абследавання бібліятэк;

– распрацоўваць планы арганізацыі мерапрыемстваў па павышэнню кваліфікацыі і перападрытоўкі супрацоўнікаў бібліятэк;

– праводзіць кансультацыі для супрацоўнікаў бібліятэк па найбольш актуальных пытаннях бібліятэчнай практыкі,

– ажыццяўляць аналіз і прагназіраванне дзейнасці бібліятэк.

### *1.4. Структура зместу вучэбнай дысцыпліны*

Дысцыпліна структурыравана па раздзелах і тэмах, якія прадстаўляюць сабой адносна самастойныя ўзбуйненыя дыдактычныя адзінкі зместу навучання. Змест тэм абапіраецца на набытыя слухачамі кампетэнцыі пры вывучэнні наступных дысцыплін: "Інфармацыйныя тэхналогіі ў бібліятэцы", "Дакументазнаўства", "Бібліятэчна-інфармацыйнае абслугоўванне чытачоў", "Бібліятэчна-інфармацыйны менеджмент".

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *1.5. Метады (тэхналогіі) навучання*

Асноўнымі метадамі (тэхналогіямі) навучання, якія адпавядаюць мэтам вывучэння дысцыпліны, з'яўляюцца:

– тэхналогія праблемнага навучання (праблемнае выкладанне, часткова-пошукавы метад), якая рэалізуецца на лекцыйных занятках;

– тэхналогія навучання як вучэбнага даследвання, якая рэалізуецца на практычных занятках і пры самастойнай рабоце студэнта;

– камунікатыўныя тэхналогіі, заснаваныя на актыўных формах і метадах навучання (дыскусія, спрэчка-дыялог, вучэбныя дэбаты, круглы стол і інш.).

### *1.6. Арганізацыя самастойнай работы слухачоў*

Пры вывучэнні дысцыпліны выкарыстоўваюцца наступныя формы самастойнай работы:

– кіруемая самастойная работа – выконванне індывідуальных (групавых) заданняў у пазааўдыторны час з кансультацыямі выкладчыка;

– падрыхтоўка рэфератаў па індывідуальным тэмам.

### *1.7. Дыягностыка кампетэнцый слухачоў*

Для ацэнкі вучэбных дасягненняў слухачоў выкарыстоўваюцца крытэрыі, зацверджаныя Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Ацэнка вучэбных дасягненняў слухачоў на экзамене ажыццяўляецца з улікам актыўнасці работы студэнта на лекцыйных, семінарскіх а таксама з улікам дасягненняў і выконвання ім кантралюемай і кіруемай самастойнай работы, якасці выканання кантрольнай работы.

Для ацэнкі дасягненняў слухачоў выкарыстоўваецца наступны дыягнастычны інструментарый:

– выступленне слухача на семінары з падрыхтаваным інфармацыйным (тэматычным) паведамленнем, па падрыхтаванаму рэферату;

– падрыхтоўка рэферата па тэме прапанаванай у спісе рэфератаў для СРС;

– правядзенне бягучых кантрольных апросаў па асобным тэмам;

– абарона заданняў выкананых на практычных занятках;

– абарона выкананых у рамках кіруемай самастойнай работы індывідуальных (групавых) заданняў;

– здача заліку па дысцыпліне.

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне дысцыпліны “Навукова-метадычная дзейнасць бібліятэк” прадугледжваецца 38 гадзін, з іх 18 – аўдыторныя заняткі (лекцыі – 14, семінарскія – 4), 20 гадзін самастойная работа.

Форма выніковага кантролю – залік.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 2. ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Назвы раздзелаў і тэм | Колькасць гадзін | | | |
|---|---|---|---|---|
| | Усяго | Лекц. | Сем. | Самаст. работа |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| Уводзіны ў курс "Навукова-метадычная дзейнасць бібліятэк" | 1 | 1 | | |
| **Раздзел 1. Сутнасць навукова-метадычнай работы бібліятэк** | | | | |
| Тэма 1. Навукова-метадычная дзейнасць: асноўныя накірункі, прынцыпы і функцыі | 3 | 1 | | 2 |
| **Раздзел 2. Асноўныя напрамкі навукова-метадычнай работы** | | | | |
| Тэма 2. Метадычны маніторынг. Аналітычная дзейнасць бібліятэк. | 4 | 2 | | 2 |
| Тэма 3. Кансультацыйна-метадычная дапамога бібліятэкам | 3 | 1 | | 2 |
| Тэма 4. Дзейнасць метадычных цэнтраў па распаўсюджванню інавацыйнага вопыту. | 4 | 2 | | 2 |
| Тэма 5. Павышэнне кваліфікацыі і перападрыхтоўка бібліятэчных кадраў як накірунак навукова-метадычнай дзейнасці | 3 | 1 | | 2 |
| **Раздзел 3. Метадычныя службы бібліятэк** | | | | |
| Тэма 6. Гісторыя станаўлення і сучасны стан метадычных служб бібліятэк | 2 | | | 2 |
| Тэма 7. Метадычныя службы бібліятэк, арганізацыя іх работы. | 4 | 2 | | 2 |
| **Тэма 8.** Атэстацыя персанала бібліятэкі як накірунак дзейнасці метадычнай службы і як форма ацэнкі супрацоўнікаў і іх дзейнасці. | 3 | 1 | | 2 |
| Тэма 9. Метадыст: прафесійныя рысы і структура прафесійнай дзейнасці | 5 | 1 | 2 | 2 |
| Тэма 10. Новыя інфармацыйныя тэхналогіі ў метадычным забеспячэнні дзейнасці бібліятэк | 6 | 2 | 2 | 2 |
| УСЯГО | 38 | 14 | 4 | 20 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ДЫСЦЫПЛІНЫ

## Уводзіны ў курс "Навукова-метадычная дзейнасць бібліятэк"

Прадмет, змест і задачы вучэбнай дысцыпліны "Навукова-метадычная работа". Яе месца ў сістэме прафесійнай падрыхтоўкі будучага спецыяліста. Практычная накіраванасць курса. Веды, уменні, вопыт, якія набываюць студэнты ў працэсе вывучэння курса. Яго ўзаемасувязі з іншымі спецыяльнымі прадметамі інфармацыйна-дакументнага цыкла. Асноўныя віды вучэбных заняткаў і арганізацыя самастойнай работы студэнтаў. Формы кантролю. Характарыстыка забяспечанасці курса вучэбна-метадычнай дакументацыяй.

## Раздзел 1. Сутнасць навукова-метадычнай работы бібліятэк

### *Тэма 1. Навукова-метадычная дзейнасць: асноўныя накірункі, прынцыпы і функцыі*

Метадычнае забеспячэнне дзейнасці бібліятэк, яго сутнасць і задачы. Змест паняцця "метадычная работа". Асноўныя задачы метадычнай работы на сучасным этапе. Узроўні метадычнага забеспячэння дзейнасці бібліятэк.

Асноўныя прынцыпы метадычнага забеспячэння дзейнасці бібліятэк: навуковасць, актыўнасць, рэкамендацыйнасць, дыферэнцыраваны падыход, непасрэдная сувязь з бібліятэкамі, аператыўнасць, сістэматычнасць і планавасць.

Функцыі метадычнага забеспячэння бібліятэчнай дзейнасці: інфармацыйная, педагагічная, аргнізацыйная, навукова-даследчая. Узаемасувязь навукова-даследчай і навукова-метадычнай дзейнасці.

Асноўныя накірункі метадычнага забеспячэння: аналітычная дзейнасць, кансультацыйна-метадычная дзейнасць, дзейнасць па фарміраванню і садзейнічанню засваення бібліятэчных новаўвядзенняў, павышэнне кваліфікацыі і перападрыхтоўка бібліятэчных кадраў.

Дыскусійныя пытанні метадычнага забеспячэння дзейнасці бібліятэк у сучасных умовах.

## Раздзел 2. Асноўныя напрамкі навукова-метадычнай работы

### *Тэма 2. Метадычны маніторынг. Аналітычная дзейнасць бібліятэк.*

Метадычны маніторынг як сістэма назірання за зменамі ў дзейнасці бібліятэк. Вызначэнне паняцця "метадычны маніторынг". Яго аб'екты і асноўныя крыніцы інфармацыі. Кумуліраванне звестак у сістэме метадычнага маніторынга. Інфармацыйна-пошукавы апарат метадычнага маніторынга.

Абследаванне дзейнасці бібліятэк як асноўны метад атрымання інфармацыі для яго наступнага аналізу. Асноўныя метады абследавання бібліятэк: непасрэднае назіранне, вывучэнне дакументаў, беседы з бібліятэчнымі супрацоўнікамі і карыстальнікамі, метад анкетнага апытання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Віды абследавання бібліятэк. Мэты і аб'екты франтальнага і тэматычнага абследаванняў. Этапы правядзення абследавання. Методыка абследавання бібліятэк.

Аналіз бібліятэчнай практыкі: аналіз зместу дзейнасці бібліятэк, аналіз метадаў і вынікаў работы. Колькасны і якасны аналіз, іх асноўныя метады.

Сістэматызацыя фактычнага матэрыялу. Выніковыя дакументы аналітычнай дзейнасці: статыстысныя зводкі, заключэнні па справаздасчам і планам бібліятэк, агляды дзейнасці бібліятэк. Методыка складання аглядаў дзейнасці бібліятэк. Выкарыстанне вынікаў аналітычнай дзейнасці ў метадычным забеспячэнні работы бібліятэк.

### *Тэма 3. Кансультацыйна-метадычная дапамога бібліятэкам*

Кансультацыйна-метадычная дапамога бібліятэкарам як адна з традыцыйных форм метадычнай дапамогі. Асноўныя патрабаванні да метадычнага кансульціравання. Формы навукова-метадычнага кансульціравання.

Падрыхтоўка, выданне і распаўсюджванне метадычных выданняў як асноўны шлях актыўнага кансультацыйна-метадычнага ўздзеяння. Сістэма метадычных выданняў для бібліятэк, асноўныя віды і групы: метадычныя дапаможнікі; інструктыўна-метадычныя дапаможнікі; вучэбна-метадычныя дапаможнікі; інфармацыйныя дапаможнікі; апісанні бібліятэчных новаўвядзенняў; бібліяграфічныя дапаможнікі ў дапамогу бібліятэкару; метадычныя выданні комплекснага характару.

Патрабаванні да зместу і складанню метадычных выданняў. Вывучэнне эфектыўнасці метадычных рэкамендацый і інш.

### *Тэма 4. Дзейнасць метадычных цэнтраў па распаўсюджванню інавацыйнага вопыту*

Інавацыйная дзейнасць у бібліятэках, яе значэнне і змест. Крыніцы новаўвядзенняў у бібліятэчную практыку. Асноўныя этапы інавацыйных працэсаў ў бібліятэцы. Інфармацыйнае забеспячэнне інавацыйнай дзейнасці.

Новаўвядзенні, іх выяўленне, вывучэнне і абагульненне. Прапаганда новаўвядзенняў і распаўсюджванне іх па бібліятэкам. Кіраванне новаўвядзеннямі ў бібліятэках: стварэнне новаўвядзенняў з дапамогай эксперыментальных метадаў, іх укараненне і дапамога бібліятэкам у засваенні.

### *Тэма 5. Павышэнне кваліфікацыі і перападрыхтоўка бібліятэчных кадраў як накірунак навукова-метадычнай дзейнасці*

Павышэнне кваліфікацыі кадраў бібліятэкі як неабходная ўмова ў сістэме развіцця персаналу. Патрабаванні да сістэмы павышэння кваліфікацыі: усеагульнасць, дыферынцыраваны падыход, развіццё творчай ініцыятывы бібліятэкараў, сістэматычнасць і паслядоўнасць. Асноўныя напрамкі і формы павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі бібліятэчных кадраў: курсы павышэння кваліфікацыі, навукова-практычныя канферэнцыі, семінары, практыкумы, стажыроўкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Інавацыйныя метады і формы навучання ў сістэме павышэння кваліфікацыі бібліятэчных спецыялістаў. Самаадукацыя як важнейшая форма павышэння кваліфікаці бібліятэкараў. Удасканаленне сістэмы павышэння кваліфікацыі метадыстаў. Інфармацыйнае забеспячэнне сістэмы павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі бібліятэчных кадраў.

## Раздзел 3. Метадычныя службы бібліятэк

### *Тэма 6. Гісторыя станаўлення і сучасны стан метадычных служб бібліятэк*

Гісторыя стварэння метадычных служб у бібліятэках: асноўныя этапы, праблемы, сучаснае становішча, перспектывы. Прыярытэты ў дзейнасці метадычных служб. Навукова-метадычныя цэнтры (галіновыя, рэгіянальныя, акадэмічныя, ВНУ і інш.), іх асноўныя функцыі і задачы.

Змена метадычнага кіраўніцтва метадычным забеспячэннем функцыяніравання бібліятэк як галоўная асаблівасць метадычнай дзейнасці на сучасным этапе развіцця.

Прафесіяналізацыя навукова-метадычнай дзейнасці бібліятэк.

### *Тэма 7. Метадычныя службы бібліятэк, арганізацыя іх работы*

Метадычныя службы бібліятэк, накірункі іх дзейнасці. Метадычны кабінет, яго фонд і даведачна-пошукавы апарат. Тэхнічныя сродкі метадычнай работы. Улік, справаздачнасць і планаванне метадычнай дзейнасці. Структура метадычных служб бібліятэкі, размеркаванне абавязкаў паміж метадыстамі. Нарміраванне працы метадыстаў.

Праблемы фарміравання кадраў метадычных служб.

### *Тэма 8. Атэстацыя персанала бібліятэкі як накірунак дзейнасці метадычнай службы і як форма ацэнкі супрацоўнікаў і іх дзейнасці*

Атэстацыя як комплекснае мерапрыемства, як агульнапрызнаная і распаўсюджаная форма ацэнкі супрацоўнікаў бібліятэк і іх дзейнасці. Віды атэстацыі: рэгулярная асноўная, разгорнутая; рагулярная прамежкавая, спрошчаная; нерэгулярная, вызваная чрэзвычайнымі абставінамі. Перыядычнасць правядзення атэстацыі. Галоўная і дадатковыя мэты правядзення атэстацыі. Задачы атэстацыі.

Фарміраванне складу атэстацыйнай камісіі. Стварэнне пакету неабходных дакументаў для атэстацыі: палажэнне аб адзеле; службовыя і тэхналагічныя інструкцыі; апытальнік; характарыстыка-водгук; форма самаацэнкі дзейнасці спецыяліста.

Вызначэнне патрабаванняў да супрацоўнікаў у залежнасці ад кваліфікацыі. Вызначэнне крытэрыяў ацэнак і патрабаванняў да персаналу. Вынікі атэстацыі і парадак іх давядзення да атэстуемых.

Методыка падрыхтоўкі і правядзення атэстацыі персаналу, асноўныя этапы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***Тэма 9. Метадыст: прафесійныя рысы і структура прафесійнай дзейнасці***

Прафесія метадыста, яе сутнасць. Асноўныя кваліфікацыйныя патрабаванні, якія прад'яўляюцца да метадыста бібліятэкі. Дзелавыя і асабістыя якасці, якімі павінен валодаць метадыст. Фактары прафесійнай сталасці метадыста бібліятэкі. Асаблівасці прафесійнага цыклу метадыста, этапы прафесійнага цыклу метадыста.

Арганізацыя прафесійнай вучобы метадычных кадраў.

***Тэма 10. Новыя інфармацыйныя тэхналогіі ў метадычным забеспячэнні дзейнасці бібліятэк***

Прымяненне інфармацыйных тэхналогій пры ажыццяўленні асноўных накірункаў метадычнай работы: у працэсе аналітычнай дзейнасці метадычных цэнтраў і служб, кансультацыйна-метадычнай дзейнасці, дзейнасці па фарміраванню і садзейнічанню засваення бібліятэчных новаўвядзенняў, у працэссе павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі бібліятэчных кадраў.

Фактары, якія стрымліваюць прымяненне інфармацыйных тэхналогій у метадычным забеспячэнні дзейнасці бібліятэк. Пазітыўныя змены ў навукова-метадычнай рабоце абумоўленыя ўкараннем інфармацыйных тэхналогій. Перспектывы развіцця метадычнага забеспечэння дзейнасці бібліятэк у сувязі з прымяненнем новых інфармацыйных тэхналогій.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЛІТАРАТУРА

## *Асноўная*

1. Авраева, Ю. Б., Очирова, Э. С. Методист библиотеки: формула успеха: научно-методическое пособие. – М.: Либерея-Бибйнформ, 2008. – 96 с.

2. Авраева, Ю.Б. Методическая деятельность библиотек: традиции и инновации / Ю.Б.Авраева, Э.С.Очирова // Библиотечное дело – XXI век: Науч.-практ. сб. Вып. 2(6) / Рос. гос. б-ка. – М., 2003. – 304 с. (Прил. к журн. «Библиотековедение»). – С. 272 – 286.

3. Басов, С. Проблемы и перспективы перестройки методической работы: взгляд из 1988 года] / С.Басов // Библиотечное дЪло. – 2010. – № 11 (125). – С.2 – 7.

4. Ванеев, А.Н. Методическое обеспечение библиотечной деятельности: учеб. пособие / А.Н. Ванеев; СПбГУКИ. – М., 2002. – 140 с. - (Серия "Современная библиотека"; Вып. 10).

5. Ванеев, А.Н. Нужно ли библиотекам методическое руководство? // Ванеев А.Н. Библиотечное дело: теория, методика, практика. – СПб., 2004. – С. 336.

6. Ванеев, А.Н. Проблемы методического мониторинга // Ванеев А.Н. Библиотечное дело: теория, методика, практика. – СПб., 2004. – С. 342 – 343.

7. Ванеев, А.Н. Проблемы перестройки методической деятельности // Ванеев А.Н. Библиотечное дело: теория, методика, практика. – СПб., 2004. – С. 318 – 330.

8. Дрешер, Ю.Н. К вопросу о приоритетах в деятельности методической службы / Ю.Н. Дрешер, Т.И. Ключенко // НТБ. – 2001. - №1. – С. 94 – 101.

9. Качанова, Е.Ю. Инновации в библиотеках / Е.Ю. Качанова; науч. ред. В.А. Минкина; СПбГУКИ. – СПб.: Профессия, 2003. – 318 с. – (Серия «Библиотека»).

10. Качанова, Е.Ю. Инновационно-методическая работа библиотек: учеб. пособие / Е. Ю. Качанова ; ХГИИК ; науч. ред. А. Н. Ванеев. – СПб.: Профессия, 2007. – 336 с. – (Серия «Библиотека»).

11. Методическое обеспечение библиотечной деятельности // Справочник библиотекаря / Науч. ред. А. Н. Ванеев, В. А. Минкина. – 3-е изд., перераб. и доп. – СПб.: Профессия, 2005. – С. 387 – 402. – (Серия «Библиотека»).

12. Ратникова, О.Л. Организационно-технологические проблемы взаимодействия инновационной и методической деятельности / О.Л. Ратникова // Библиотечное дело – XXI век: Науч.-практ. сб. Вып. 2(6) / Рос. гос. б-ка. – М., 2003. – 304 с. (Прил. к журн. «Библиотековедение»). – С. 286 – 300.

13. Справочник библиотекаря / Науч. ред. А. Н. Ванеев, В. А. Минкина. – 3-е изд., перераб. и доп. – СПб.: Профессия, 2005. – С. 419 – 429. – (Серия «Библиотека»).

14. Сукиасян, Э.Р. Библиотечная профессия. Кадры. Непрерывное образование: сб. статей и докладов. – М., 2004. – 448 с. – (Специальный издательский проект для библиотек).

15. Суслова, И.М. Методическая работа библиотеки: Перспективные концепции: Учеб. пособие / И.М.Суслова. – М.: МГУК, 1995. – 48 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***Дадатковая***

16. Бачалдин, Б.Н. Менеджмент в научно-методической работе: в помощь библиотекарю / Б.Н. Бачалдин, Л.М. Инькова; РГБ. – М., 1993. – 255 с.

17. Библиотечный менеджмент: Дидактическое пособие / М-во культуры РФ; Моск. гос. ун-т культуры и искусств; Под общ. ред. В.К.Клюева (отв. за вып.) и И.М.Сусловой. – М.: Профиздат, Изд-во Моск. гос. ун-та культуры и искусств, 2001. – 208 с.

18. Дворкина, М. Я. Как долго длится инновация? / М.Я.Дворкина // Библиосфера. – № 4. – 2009. – С. 15–18.

19. Дергилева, Т. В. Научно-методическая деятельность центральных библиотек: организация и приоритетные направления : учеб.-метод. пособие / Т. В. Дергилева ; науч. ред. Л. А. Кожевникова ; Гос. публич. науч.-техн. б-ка Сиб. отд-ния Рос. акад. наук. – Новосибирск : ГПНТБ СО РАН, 2007. – С. 40–49.

20. Дригайло, В.Г. Основы управления библиотекой высшего учебного заведения: Научно-практическое пособие / В.Г.Дригайло, Е.В.Башун., В.Н.Волынец. – 2-е изд., пере-раб. и доп. – М.: Либерея, 2004. – С. 63 – 78.

21. Кадры в культуре. Образцы должностных инструкций служащим культурно-просветительных учреждений. С приложением CD / сост. Л.И.Липень. – Минск: Дикта, 2009. – 212 с.

22. Как подготовить и провести международную конференцию: методическое пособие / ФБ БГУ; сост. И.Б. Стрелкова, Ю.Л. Дедёнок; ред. А.В. Бутина. – Минск, 2005. – 36 с.

23. Матлина, С.Г. Публичная библиотека: пути инновационного развития: избранное / С. Г. Матлина. – Санкт-Петербург : Профессия, 2009. – 390 с.

24. Межотраслевые нормы времени на работы, выполняемые в библиотеках // Библиотека и закон. – М., 1997. – Вып. 3. – С. 337 – 399.

25. Новожилова, Н.В. Использование современных информационно-коммуникационных технологий в работе методических центров / Н.В. Новожилова // Методист. – 2005. - №1. – С. 16 – 22.

26. Паршукова, Г.Б. Компьютерные средства в научно-методической работе библиотек / Г.Б. Паршукова // Библиотечное дело – XXI век: научно-практ. сб.: Вып. 1 (7). – 2004. – С. 139 – 145.

27. Паршукова, Г.Б. Научно-методическая работа библиотекарей на персональном компьютере [Текст] : учеб.-метод. пособие / Г.Б. Паршукова; ГПНТБ Сиб. отд-ния Рос. акад. наук. – 2-е изд., перераб. и доп. – Новосибирск : [б. и.], 2003. – 95 с.

28. Пашин, А. И. Управление библиотечным делом: системный подход: учебно-метод. пособие / А.И.Пашин. – М.: Либерея-Бибинформ, 2008. – С. 43 – 50.

29. Плохотник, Т. "Бойцы невидимого фронта". Заметки из блокнота / Т. Плохотник // Библиотечное дЪло. – 2010. – № 11 (125). – С.36–38.

30. Рамазанова, Н. Корни и крона. Идти впереди каравана / Н. Рамазанова // Библиотечное дЪло. – 2010. – № 11 (125). – С.42 – 44.

31. Стрелкова, И. Б. Формирование кадровых ресурсов библиотек в новой информационной среде: научно-практическое пособие / И. Б. Стрелкова. – Минск: Новое знание, 2008. – 221 с.

32. Цурина, И. Виртуальная методическая служба. Используем новый ресурс // Библиотечное дЪло. – 2010. – № 11 (125). – С.39 – 41.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## СЕМІНАРСКІЯ ЗАНЯТКІ

### Тэма: *Новыя інфармацыйныя тэхналогіі ў метадычным забеспячэнні дзейнасці бібліятэк*

*2 гадзіны*

**Пытанні для абмеркавання:**

1. Прымяненне новых інфармацыйных тэхналогій (НІТ) пры ажыццяўленні метадычнымі службамі метадычнага маніторынгу, аналітычнай дзейнасці.
2. Прымяненне НІТ пры акумуліраванні і распаўсюджванні інавацыйнага вопыту бібліятэк.
3. Прымяненне НІТ пры павышэнні кваліфікацыі бібліятэкараў-бібліёграфаў.
4. Прымяненне НІТ пры падрыхтоўцы і выданні метадычных дапаможнікаў.
5. Віртуальныя метадычныя службы: агульная характарыстыка, прыклады.

**Прапануемая літаратура:**

1. Авраева, Ю. Б. Методист библиотеки: формула успеха: научно-методическое пособие / Ю. Б Авраева, Э. С. Очирова. – М.: Либерея-Бибйнформ, 2008. – С. 25 – 32.
2. Библиотечные телеконференции // Справочник библиотекаря / Науч. ред. А. Н. Ванеев, В. А. Минкина. – 3-е изд., перераб. и доп. – СПб.: Профессия, 2005. – С. 423 – 429. – (Серия «Библиотека»).
3. Паршукова, Г.Б. Компьютерные средства в научно-методической работе библиотек / Г.Б. Паршукова // Библиотечное дело – XXI век: научно-практ. сб.: Вып. 1 (7). – 2004. – С. 139 – 145.
4. Паршукова, Г.Б. Научно-методическая работа библиотекарей на персональном компьютере [Текст] : учеб.-метод. пособие / Г.Б. Паршукова; ГПНТБ Сиб. отд-ния Рос. акад. наук. – 2-е изд., перераб. и доп. – Новосибирск : [б. и.], 2003. – 95 с.
5. Цурина, И. Виртуальная методическая служба. Используем новый ресурс // Библиотечное дЪло. – 2010. – № 11 (125). – С.39 – 41.

*Заўвага: Студэнты маюць права карыстацца дакументальнымі крыніцамі, знойдзенымі імі самастойны, пры ўмове таго, што дакументы адпавядаюць тэме семінара і разглядаемым пытанням.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### Тэма: *Роля асобы метадыста ў пасяховасці метатыднага забеспячэння бібліятэчнай дзейнасці*

*2 гадзіны*

**Пытанні для абмеркавання:**

1. Тыпалогія асобы метадыста.
2. Веды і ўменні неабходныя метадысту.
3. Асноўныя патрабаванні да асобы метадыста.

4. Фактары прафесійнай сталасці метадыста. Адказнасць як аснова прафесійнай сталасці метадыста.

5. Асаблівасці прафесійнага цыклу метадыста.

6. Роля асобы метадыста ў поспяховасці метатыднага забеспячэння бібліятэчнай дзейнасці (*пытанне-разважанне*).

**Прапануемая літаратура:**

1. Авраева, Ю. Б. Методист библиотеки: формула успеха: научно-методическое пособие / Ю.Б.Авраева, Э.С.Очирова. – М.: Либерея-Бибйнформ, 2008. – 96 с.

2. Авраева, Ю.Б. Методическая деятельность библиотек: традиции и инновации / Ю.Б.Авраева, Э.С.Очирова // Библиотечное дело – XXI век: Науч.-практ. сб. Вып. 2(6) / Рос. гос. б-ка. – М., 2003. – 304 с. (Прил. к журн. «Библиотековедение»). – С. 272 – 286.

3. Плохотник, Т. "Бойцы невидимого фронта". Заметки из блокнота / Т. Плохотник // Библиотечное дЪло. – 2010. – № 11 (125). – С.36–38.

*Заўвага: Студэнты маюць права карыстацца дакументальнымі крыніцамі, знойдзенымі імі самастойны, пры ўмове таго, што дакументы адпавядаюць тэме семінара і разглядаемым пытанням.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# САМАСТОЙНАЯ РАБОТА

## 1. Тэматыка рэфератаў для СРС

1. Гісторыя станаўлення і сучасны стан метадычных служб бібліятэк
2. Дыскусійныя пытанні метадычнага забеспячэння дзейнасці бібліятэк.
3. Метадычны маніторынг.
4. Метадычныя дапаможнікі ў дапамогу бібліятэкам (агляд).
5. Кіраванне наваўвядзеннямі ў бібліятэках.
6. Новае ў павышэнні кваліфікацыі і перападрыхтоўкі бібліятэчных кадраў.
7. Прафесіяграма метадыста бібліятэкі.
8. Метадычныя і іннавацыйныя службы бібліятэк.

**Рэферат прадстаўляе сабой** самастойную пісьмовую работу слухача. Тэкст рэферата павінен змяшчаць аргументаванае выкладанне пэўнай тэмы. Рэферат змяшчае наступныя раздзелы:

1. Уводзіны.
2. Асноўная частка.
3. Заключэнне.
4. Літаратура (спіс выкарыстаных крыніц).

Ва *ўводзінах* аўтар указвае на актуальнасць тэмы, прыводзіць яе абгрунтаванне. У *асноўнай частцы* кратка і лаканічна выкладаецца тэарэтычны аспект рэферыруемай праблемы. Аргументуецца свой асабовы погляд па разглядаемай праблеме, тэме. У *заключэнні* аўтар абагульняе палажэнні, выказаныя ва ўводзінах і асноўнай частцы, робіць вывады.

*Спіс выкарыстаных крыніц* афармляецца па алфавіту, ён павінен змяшчаць не меньш 10 публікацый за апошнія 10 гадоў.

Аб'ём рэферата: 10–15 старонак машыначытаемага тэксту фармата А-4.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПЫТАННІ ДА ЗАЛІКУ

1. Навукова-метадычная дзейнасць бібліятэк, агульная характарыстыка.
2. Прынцыпы метадычнага забеспячэння дзейнасці бібліятэк.
3. Функцыі метадычнага забеспячэння дзейнасці бібліятэк.
4. Асноўныя накірункі метадычнага забеспячэння бібліятэчнай дзейнасці.
5. Аналітычная дзейнасць метадычных служб бібліятэк, агульная характарыстыка.
6. Метадычны маніторынг як сістэма назірання за зменамі ў бібліятэчнай дзейнасці.
7. Абследаванне дзейнасці бібліятэк, агульная характарыстыка.
8. Франтальнае абследаванне бібліятэк, агульная характарыстыка.
9. Тэматычнае абследаванне бібліятэк, агульная характарыстыка.
10. Методыка правадзення абследавання бібліятэк.
11. Аналіз вынікаў работы як сродак ацэнкі ступені эфектыўнасці дзейнасці бібліятэк.
12. Кансультацыйна-метадычная дапамога бібліятэкарам. Асноўныя патрабаванні да метадычнага кансульціравання.
13. Сістэма метадычных выданняў як элемент навукова-метадычнага забеспячэння дзейнасці бібліятэк. Асноўныя патрабаванні да метадычных выданняў.
14. Асноўныя групы і віды метадычных выданняў для бібліятэк, агульная характарыстыка.
15. Дзейнасць бібліятэк-метадычных цэнтраў па распаўсюджванню іннавацыйнага вопыту. Этапы інавацыйнай дзейнасці метадычных цэнтраў.
16. Кіраванне іннавацыямі як комплексны працэс навукова-метадычнай дзейнасці бібліятэк.
17. Павышэнне кваліфікацыі і перападрыхтоўка бібліятэчных кадраў як накірунак навукова-метадычнай дзейнасці
18. Формы павышэння кваліфікацыі бібліятэчнага пераналу, агульная характарыстыка.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ